наносяцца часам устойлівым структурам думкі, паводзін, арганізацыі» [2, с. 107–108].

Такім чынам, спецыфіка рэцэпцыі мастацка-публіцыстычнага тэксту С. Алексіевіч дэтэрмінуе значнасць аўтарскага модусу, у якім суб’ектна-ацэначная пазіцыя аўтара дапамагае рэцыпіенту ў спасціжэнні скрытых імпліцытных сэнсаў тэкстаў. Мастацка-публіцыстычны тэкст пісьменніцы, з аднаго боку, адлюстроўвае стэрэатыпы масавай, нацыянальнай свядомасці, а з іншага – скіроўвае чытача да пэўнага тыпу рэцэпцыі твора, фарміруючы тым самым жыццёвыя прыярытэты, мадэлі паводзін, філасофію мыслення.

Спіс выкарыстанай літаратуры

1. Алексиевич, С. А. Чернобыльская молитва / С. А. Алексиевич. – М. : Остожье, 1998. – 223 с.
2. Бернштейн, Б. М. Традиция и социокультурные структуры / Б. М. Бернштейн // Совет. этнография. – 1981. – № 2.

**М.І. Сянкевіч**
Брэст, УА «БрДУ імя А.С. Пушкіна»

## НАВУЧАННЕ МАЛОДШЫХ ШКОЛЬНІКАЎ СКЛАДАННЮ ФАНТАЗІЙНЫХ ГІСТОРЫЙ

Няма нічога ў нашым паўсядзённым жыцці і ў нашай свядомасці, чаго нельга было б перадаць словам. Невыказную радасць адчувае дзіця, кожны раз адкрываючы для сябе, што адным і тым жа словам можна назваць розныя рэчы, дзеянні, з’явы, што ў яго можна проста гуляць, нарэшце, што ўжо ў самім слове прыхавана патаемная меладычнасць.

Чаму слова *грозны* вымаўляецца строга, а слова *ціхі* – ледзь чутна? Чаму слова *хутка* вымаўляецца паскорана, а слова *павольна* – наадварот? Пытанні, на якія дзеці наўрад ці адкажуць, але галоўнае – задумаюцца над імі, здзівяцца з’явам і назвам, пачнуць параўноўваць. Слова *ўсё можа* – да такой высновы прыходзяць вучні, адчуваючы ўсемагутнасць і ўніверсальнасць гэтай моўнай адзінкі. Менавіта слова вылучае «нешта» з бясконцага свету прадметаў, з’яў і пачуццяў і замацоўвае ў дзіцячай свядомасці, робіць гэта «нешта» фактам свядомасці.

У дадзеным артыкуле размова ў першую чаргу пойдзе пра асацыяцыі, выкліканыя словам. Знакаміты італьянскі пісьменнік і педагог Джані Радары, аўтар кнігі «Граматыка фантазіі», заўважыў у гэтай сувязі, што слова, якое запала ў дзіцячую душу, выклікае цэлы шэраг ланцуговых рэакцый, нараджае гукі і вобразы, асацыяцыі і ўспаміны.

Тое, у якой ступені слова здольнае валодаць разнастайным сэнсава-выяўленчым зместам, куды яно можа «павесці» за сабой, праілюстравана пісьменнікам у прыёме, названым ім ***«Камень, кінуты ў сажалку»***. Калі камень кінуць у ваду – усё пойдзе ў рух: галовы гарлачыкаў, паплаўкі, што ціха ляжалі на вадзе. Апускаючыся ўніз, камень расштурхоўвае водарасці, пужае рыб, урэшце, уздымае са дна каламуць. Так і слова, якое захапіла, здзівіла, распаўсюджвае «хвалі» ў шырыню і ў глыбіню, выклікае ланцуговыя рэакцыі, асацыяцыі, уяўленні, успаміны і мары.

Для ілюстрацыі возьмем тое ж слова *камень* і пастараемся спрагназаваць асацыяцыі, якія могуць быць ім выкліканы.

Па-першае, *камень* «працягвае руку» словам, што рыфмуюцца ці маюць падобную гукавую абалонку, напрыклад *прамень, агмень, алень, абмен*, *узамен, экзамен.*

Яшчэ слова *камень* можа «паклікаць да сябе» блізказначныя словы, напрыклад *валун, мармур, глыба*, *цэгла*, *брук*, *шаша*.

Усё гэта «лянівыя» асацыяцыі. Для таго каб запалілася «іскрынка» творчасці, іх часцей за ўсё мала. Але ж можа здарыцца, што непрадказальная памяць павядзе нас у мінулае. Тады аматарам марскіх вандровак успамінаецца галька на моры, альпіністам – каменяпады. Усім, чыё дзяцінства прайшло на берагах рэчак ці азёр, узгадаецца, як малымі спаборнічалі паміж сабой: чый камень упадзе далей, а чый больш разоў «чыркне» па вадзе. Перад філолагам, можа атрымацца, усплыве ланцужок устойлівых зваротаў: *каса на камень*, *камень за пазухай*, *збіраць камяні, сізіфава праца*.

Дарасламу, магчыма, удасца «падштурхнуць» работу ўяўлення юных фантазёраў, калі слова запісаць па вертыкалі, літара пад літарай, а справа размясціць першую з прапанаваных дзецьмі лексічных адзінак:

*к – кот*

*а – алешнік*

*м – музыка*

*е – елка*

*н – ноч*

Асабіста нам у даным выпадку бачыцца вучоны кот-музыкант, накшталт пушкінскага, які ў начным лесе між елак і алешын пачаў свой каціны канцэрт.

Яшчэ адзін прыём (ён таксама апісаны ў кнізе Джані Радары «Азбука фантазіі») мае назву ***«Вольны прэфікс»***. Гэтае практыкаванне вучыць даследаваць магчымасці слоў, стымулюе моўную свабоду, заахвочвае антыканфармізм. Заўважана, што дзецям больш падабаецца дабаўляць прыстаўкі грэка-лацінскага паходжання. Ці не таму, што яны шырока ўжываюцца ў назвах персанажаў папулярных сучасных коміксаў і

мультыплікацыйных серыялаў? Героем гісторыі, складзенай на аснове прыёму «Вольны прэфікс» можа стаць, напрыклад, *анты*парасон, які прыцягвае да сябе вадзяныя струмені; *супер*запалка, здольная запаліць ранішнюю зару; *максі*-коўдра – настолькі вялікая, што ратуе ад холаду цэлы дом або горад; *антыгармата*, з выстралам якой заціхаюць на свеце ўсе войны. А яшчэ можна прыдумаць гісторыі пра *супер*кнігу і *супер*глобус, *мікра*гіпапатама і *міні*-насарога…

Урэшце, можна прыстаўкі тыпу *супер*, *віцэ*, *аэра*, *анты*, *мота*, *астра, аква, відэа, мона ды інш.* і назоўнікі, напрыклад *веласіпед*, *кніга, пэндзаль, аловак*, *лесвіца*, *вежа* і інш. запісаць у два слупкі, а пасля іх камбінаваць, як атрымаецца. Не можа быць, каб ніводная з камбінацый не прывяла ў рух творчае ўяўленне 6–10-гадовых прыдумшчыкаў.

Даследаваць магчымасці слоў-назваў дапамагае гульнявое практыкаванне ***«Метад Рабінзона»***. Як вядома, герой рамана Даніэля Дэфо 28 гадоў знаходзіўся на дзікім ненаселеным востраве, і тыя прадметы, што выпадкова траплялі яму ў рукі, выкарыстоўваў з максімальна магчымай карысцю. Сутнасць названага прыёму акурат і заключаецца ў тым, каб прыдумаць новае, зусім нечаканае прымяненне для прадмета. Няхай, для прыкладу, такім прадметам будзе звычайны парасон. Калі пафантазіраваць, то гэта выдатны галаўны ўбор для слана, птушынае гняздо, парашут, ёмістасць, каб пераносіць ваду, «палівачка» для градак… Яшчэ больш функцый уласцівы капелюшу. Ён неабходны, каб вітацца, абмахвацца як веерам. Гэты галаўны ўбор можна цягнуць на вяровачцы, пускаць па вадзе. Ім можна лавіць матылькоў на лузе і малькоў у ручаі. Без капелюша не абыходзіцца аніводзін фокуснік. Капялюш упрыгожыць галаву снегавіка, прыдасца і пудзілу. Як падказаў рускі паэт Сяргей Ясенін, з капелюша-цыліндра зручна карміць коней аўсом… Ды ці мала дзе яшчэ можна выкарыстаць капялюш?!

Як бачым, і парасон, і капялюш – незаменныя рэчы ў многіх абставінах. Ёсць, аднак, нямала прадметаў, якія чалавеку той ці іншай прафесіі або жывой істоце не патрэбны зусім. Але ж, калі падключыць творчае ўяўленне, кожную рэч нейкім чынам можна задзейнічаць. Гэты прыём мае назву ***«Баян для казы»***. (Памятаеце жартоўнае «Навошта казе баян?»?) Думаю, што дзеці падкажуць нам, дарослым:

*навошта вартаўніку клей;*
*навошта кату акуляры;*
*навошта рыбе парасон;*
*навошта настаўніку адбойны малаток…*

Вучням 3–4 класаў можна прапанаваць гульнявое практыкаванне ***«Дзе можна выкарыстаць?»***. Для гэтага на дошцы трэба запісаць

«вынаходніцтвы». Дзеці абавязкова дадумаюцца, якую карысць тое ці іншае з іх можа прынесці.

Так, *грэбень, які пішчыць*, будзе падаваць сігнал, калі яго бярэ нехта іншы, не гаспадар. Такі грэбень можа падказаць, што пара сходзіць да цырульніка, дапаможа выбраць сродак догляду за валасамі.

*Паслухмянае крэсла* падскоквае, калі мыюць падлогу, яно само мяняе шырыню і вышыню, ходзіць за гаспадаром па кватэры, каб ён у любы час мог прысесці і адпачыць.

*Разумная дошка* ўпотай ад настаўніцкіх вачэй выпраўляе арфаграфічныя памылкі і падказвае рашэнне задачы…

Адно і тое ж слова ў розных людзей часам выклікае дыяметральна супрацьлеглыя асацыяцыі. Нават калі гэта не так, настаўнік можа знарок прапанаваць вучням паглядзець на адзін і той жа прадмет ці з'яву з рознага боку (прыём ***«Добра-дрэнна»***). Напрыклад, ён пытае: «Мароз – гэта добра ці дрэнна?», «А спёка?», «Калабок – станоўчы ці адмоўны герой?» Вартыя рысы характару, пры жаданні, можна адшукаць нават у самых, здавалася б, «безнадзейных» персанажаў. Памятаецца, як падчас працы ў школе мы прапанавалі вучням сачыненне на тэму «Што добрага я магу сказаць пра Бабу Ягу». Як выявілася, ведзьма з касцяной нагой прыносіць карысць тым, што вядзе герояў праз самыя страшныя выпрабаванні, ад чаго яны робяцца больш моцнымі, вучацца пераадольваць уласны страх і дапамагаць іншым. Вучні задаліся пытаннем, чаму няма казак пра маладую Бабу Ягу. А яшчэ яны апраўдвалі асуджанага на людскую нелюбоў казачнага персанажа тым, што Баба Яга жыве адна, ніхто і ніколі ў жыцці ёй не паспачуваў. Таму і характар мае такі невыносны.

Іншы раз пачынаючы чытач успрымае значэнне слова зыходзячы не з канкрэтнага сэнсу, які ўклаў у яго аўтар. Слова міжволі абуджае ў дзіцячай памяці самыя розныя асацыяцыі. Не маючы магчымасці растлумачыць многія з'явы рэчаіснасці, дзіця стварае *свае «гісторыі»*. Новае слова яно прыстасоўвае да свайго разумення яго значэння, імкнецца асэнсаваць шляхам вобразнага мыслення. Хочацца прывесці прыклад з уласнага жыццёвага досведу. Памятаецца, як у 1 класе мы са сваёй настаўніцай завучвалі на памяць верш Якуба Коласа, дзе сустракаюцца такія радкі:

*У лозах шчэбет не сціхае.*
*Шум стаіць і свіст.*
*У яркім бляску спачывае*
*На ракіце ліст.*

Апошні радок (хутчэй за ўсё таму, што не ведаў значэння слова *ракіта*) пачуўся мне як «Ля ракі Целіст». Гэты Целіст уявіўся стомленым падарожнікам, што лёг адпачыць каля ракі.

У працяг сказанага згадаем і такі прыём стымулявання фантазійнага ўяўлення малодшых школьнікаў, як *«Творчая памылка»*. Час ад часу ў поўнай цішыні настаўніцкага пакоя (педагогі правяраюць вучнёўскія сшыткі) чуецца гучны смех, які праз імгненне паўтараецца яшчэ з большай сілай. Яго выклікала зусім выпадковая памылка вучня, якая нарадзіла нечаканы, кур'ёзны наватвор. Вельмі магчыма, што арфаграфічная памылка, калі да яе ўважліва прыгледзецца, можа стаць нагодай для цікавай гісторыі. І вось ужо звычайны аўтамабіль становіцца *аўтабімолем* – на ім ездзяць музыканты нейкага арыгінальнага аркестра, *атамабілем* – звышхуткаснай ракетай з атамным рухавіком або *аўтамаблінам* – своеасаблівай перасоўнай сталоўкай, дзе на хаду пякуцца смачныя аладкі і г. д.

Нават гукавая абалонка незнаёмага слова можа выклікаць у дзіцяці эстэтычную рэакцыю. Калі, напрыклад, у адной з груп дзіцячага сада мы сказалі, што ёсць такія незвычайныя словы *саксаул* і *баабаб*, узнікла многа здагадак наконт таго, што б яны маглі абазначаць. Да канца дня, па сведчанні выхавальнікаў, дадзеныя словы былі паўтораны дзецьмі некалькі дзясяткаў разоў у самых розных сітуацыях. Малым новыя словы спадабаліся, яны ўспрымалі іх «на смак», «на слых», «на аб'ём».

Часам паняційны і асацыятыўны змест слоў і словазлучэнняў аказваюцца цесна знітаванымі. Менавіта з гэтай нагоды вядомы сучасны беларускі паэт Алесь Разанаў, даючы аўтарскую характарыстыку асобным словам-паняццям, у кожнай моўнай адзінцы знаходзіць вялікую колькасць апраўданых гучаннем асацыятыўных вобразаў, не адарваных, аднак, ад паняційнага значэння слоў. «Крэйда можа памыляцца, можа рабіць крывыя высновы, але робіць гэта яна самааддана і самаахвярна, і таму заўжды мае крэдыт даверу…» (вершаказ «Крэйда»). Вучні малодшых класаў, вядома, «не дараслі» да вершаказаў Алеся Разанава, але тое, што за гукавой абалонкай слова яны бачаць не толькі паняційны змест, не выклікае сумнення.

Гаворачы пра тое, што слова – «пучок» асацыяцый і на падставе гэтага можа ўзнікнуць фантазійная тэма, мы ні ў якім разе не адмаўляем традыцыйныя віды працы, што вядуць да ўзбагачэння слоўнікавага запасу дзіцяці, вучаць заўважаць, якімі сувязямі лексічная адзінка звязана з іншымі. Маюцца на ўвазе рознага кшталту практыкаванні на падбор антонімаў, сінонімаў, рыфмаў і інш.